движения, в 1966 г. во главе с И. Наркевичем [6, л. 121]. Министерства внедряли технические средства регулировки уличного движения, улучшали подготовку шоферов.

Но в целом ситуация с безопасностью движения в лучшую сторону менялась медленно, чему препятствовал низкий уровень подготовки водителей, слабо работали комиссии общественного контроля за техническим состоянием автомобилей. Из-за нарушений законодательства о режиме рабочего времени допускалось большое количество ДТП. Основными их причинами были превышение скорости, неправильный обгон. Значимым фактором являлось низкое качество ремонта. В тоже время предупреждение аварий в 1965-66 гг. обеспечивалось улучшением учёбы водителей на местах, распространением передового опыта, использовался конкурс «За безопасность движения». Был учрежден значок «За работу без аварий», его 1-й степенью награждались шоферы, наездившие без аварий 500 тыс. км. В июле 1966 г. уже 4 тыс. шоферов из общего состава 70 тыс. работавших в системе Минавтотранса, имели такой значок. Всё это позволило за 1966 г. сократить число нарушений правил движения по Минавтотрансу БССР на 8,7%, число ДТП – на 12%, случаев управления в нетрезвом состоянии – на 26,8% [7, с. 3]. Аварии допускали, как правило, водители тех автохозяйств, где примиренчески относились к лихачам. Всё это даёт основание отметить наибольшую важность именно человеческого фактора.

**Заключение.** Вопросы обеспечения безопасности автодорожного движения приобрели общегосударственное значение, их успешное разрешение зависело от согласованной позиции ведомств, чего в полной мере достигнуто не было. Важнейшим мероприятием, которое способствовало улучшению состояния транспорта, был ежегодной техосмотр, проводимый ГАИ. Накопленный опыт безаварийной эксплуатации транспорта позволял добиваться снижения числа происшествий. Предупреждение и недопущение аварий, несчастных случаев на транспорте стало одним из пунктов транспортной политики в нашей республике, но в ней присутствовали недостатки, такие как недостаточный контроль за реализацией принятых решений, что в итоге не позволило добиться снижения нарушений.

*Список литературы*


1. Материалы Минавтотранса БССР, 1953 г. // Национальный архив Республики Беларуси (НАРБ). – Ф. 4 П. – Оп. 18 – Д. 190.
2. Постановления Совета Министров СССР за 1959 г.// Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Ф. 1966. – Оп. 23. – Д. 270.
3. Докладные записки, Брестский облисполком, 1960 г. // Государственный архив Брестской области (ГАБО). – Ф. 1096. – Оп. 2. – Д. 25.
4. Приказы, Гомельский облавтотрест, 1956 г. // Государственный архив Гомельской области (ГАГО). – Ф. 165. – Оп. 1. – Д. 2.
5. Протокол сессии Могилёвского облсовета, 1959 г. // Государственный архив Могилёвской области (ГАМгО). – Ф. 7. – Оп. 5. – Д. 698.
6. Распоряжения Гродненского облисполкома, 1969 г. // Государственный архив Гродненской области (ГАГрО). – Ф. 1171. – Оп. 3. – Д. 960.
7. Наркевич, И. Больше внимания, озабоченности / И. Наркевич // Автотранспорт Белоруссии. – 1967. – 23 февраля. – С. 3.


# ПОГЛЯДЫ БСГ НА ВЫРАШЭННЕ АГРАРНАГА ПЫТАННЯ НА БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ РАСІЙСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1905–1907 ГГ.


*А.Д. Тогулева*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Аграрнае пытанне для Беларусі, дзе асноўная маса насельніцтва да сярэдзіны XX ст. займалася сельскагаспадарчай працай, з’яўляецца адным з самых галоўных. У пачатку XX ст. назіралася абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей ў вёсцы. Гэта тлумачылася тым, што аграрная рэформа 1861 года, якая адмяніла прыгоннае права і павінна была стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця капіталістычных адносін у



Репозиторий ВГУ

сельскай гаспадарцы, была праведзена ў інтарэсах буйных землеўладальнікаў і не ліквідавала цалкам феадальныя перажыткі, якія стрымлівалі развіццё вытворчых сіл у вёсцы. У пачатку XX ст. на беларускіх землях панавала сялянскае малазямелле, цераспалосіца, на ўсходзе – абшчыннае землекарыстанне, сервітуты, адпрацоўкі і іншыя рэшткі феадальных адносін, што даводзілі беларускага селяніна да гаротнага становішча. У 1903 г. са з'яўленнем на палітычнай арэне першай беларускай нацыянальнай партыі – Беларускай сацыялістычнай грамады, аграрнае пытанне стала займаць цэнтральнае месца ў яе дзейнасці. Мэтай даследавання з'яўляецца аналіз дзейнасці БСГ па вырашэнні аграрнага пытання на Беларусі ў перыяд першай расійскай рэвалюцыі.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыяла былі выкарыстаны дакументы з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, успаміны дзеячоў БСГ, апублікаваныя ў 1995 г. «Собственноручные показания А.И. Луцкевича. 30 октября 1939 г.», Праграма БСГ, прынятая на II з'ездзе ў Мінску ў студзені 1906 г. Рэалізаваны агульналагічныя метады даследавання, а таксама метады гістарычна-параўнальнага і сістэмна-комплекснага аналізу навуковай літаратуры і крыніц.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У сакавіку 1905 г. Грамада разам з партыяй эсэраў склікае ў Мінску першы сялянскі з'езд, пасля якога была выдадзена пракламацыя «Першы мужыцкі з'езд». У гэтай пракламацыі БСГ закладае агульныя рысы сваёй будучай аграрнай праграмы, яна кажа: «Усякі ведае, што мужыку цяжка жыць на свеце. З мужыкоў цар дзярэ падаткаў больш як за ўсіх: паны плацяць 236 млн. рублей у год, а мужыкі 700 млн., значыць у тры разы больш, а зямлі ў цара і паноў у два разы болей, як у мужыкоў, і цар, і паны і чыноўнікі – усе жывуць з цяжкай мужыцкай працы...» [1, арк. 4–5].

Далей гаворыцца аб тым, што гледзячы на ўсё гэта, ў Мінск з'ехаліся прадстаўнікі ад сялян, каб вырашыць, што, ім рабіць. Яны надумаліся, што «каб кожны, хто хоча на зямлі працаваць, мог дастаць столькі зямлі, колькі яму трэба, каб з яе сваёй працай пражыць; трэба значыць, каб уся зямля належыла да тых, хто на ей працуюць. Дзеля гэтага трэба ўсю зямлю адабраць ад цара, казны ды паноў...» [1, арк. 4–5].

БСГ ясна разумела, што добраахвотна зямлю ніхто не ўступіць і што без грамадзянскай вайны не абысціся. Таму неабходна запасацца зброяй, каб абараняцца, але і каб заваяваць новы парадак карыстання зямлёй. «... Але павінны мы ведаць, – гаварылася ў пракламацыі, – што цар пашле на нас паліцыю, жандараў, казакаў ды салдат, каб бараніць сваю і панскую зямлю, ды біць і страляць нас. Тады выйдзе вялікая сварка, выйдзе вайна, і трэба нам да гэтага прыгатавацца. Трэба дастаць стрэльбы, рэвальверы і вінтоўкі, каб было чым абараніцца і заваяваць новы парадак карыстання зямлёй кожнаму, хто на ёй сам працуе» [1, арк. 6]. Такія рэвалюцыйныя лозунгі былі характэрны для БСГ у пачатковы перыяд рэвалюцыі.

Цяпер трэба разгледзець, які парадак землекарыстання ў сакавіку 1905 г. Грамада мела на ўвазе ўстанавіць, калі зямля будзе заваявана сялянамі. Перш чым прапанаваць сялянам свой праект, БСГ робіць невялікі ўступ, так разважаючы: «Можна было б даць кожнаму па кавалку, няхай сабе, па сотцы на сям'ю, але што з таго? Ужо сыны нашы не мелі б пароўну, бо адзін чалавек падзяліў бы сваю частку на двух, а другі на пяцярых сыноў, ці болей, і зноў пайшло б тое самае, што і цяпер. Трэба значыць зрабіць іначай» [1, арк. 4]. І тут Грамада прапануе два праекты. Па першаму прапаноўваецца калектыўнае карыстанне зямлёй. «Добра было б каб, уся вёска, ці часць яе, калі яна надта вялікая, не дзяліла зямлі, але каб вяла гаспадарку гуртам. Выбрала б яна сабе чалавек пяць такіх, што ўмеюць чытаць ды пісаць і шчоты ўмеюць весці, і тыя выбраныя каб запісвалі, колькі дзён кожны мужык на зямлі працаваў. Восенню кожны возьме сабе столькі хлеба, каб пракарміцца, а рэшту прададуць гуртам і дадуць кожнаму столькі грошай, колькі яму на рабоце выходзіць» [1, арк. 4].

Але праект гэты вельмі нясталы. БСГ, улічваючы настрой сялянства, як дробнаўласніцкія імкненні, відаць, баялася гэты свой праект развіваць і дэталізаваць, каб не адхіліць сялянскую масу ад рэвалюцыйнай барацьбы за зямлю.

Калі такі калектыўны спосаб карыстання зямлёй каму не спадабаецца, то Грамада прапанавала другі праект, па якому «кожная сям'я дастае столькі зямлі, колькі на яе выпадае. На гэтай зямлі працуюць 12 год ці меней, а потым выбарныя з усей вёскі



Рэпазіторый ВДУ

глядзяць, калі ў яго дзяцей прыбыло, то яму зямлі прыбаўляюць, калі дзяцей паменьшыла аднімаюць. Пры гэтым спосабе кожны вядзе гаспадарку асобна» [1, арк. 4].

Летам 1905 г. БСГ рыхтуе ўсеагульную забастоўку парабкаў і беднага сялянства Беларусі, якая павінна даць парабкам і падзёншчыкам большы заработак, а сялянам значныя палегкі, залежныя ад двору. З мэтай арганізацыі забастоўкі Грамада ў чэрвені месяцы выдае пракламацыю «Да ўсіх работнікаў і работніц дваровых, да ўсіх дзеравенскіх людзей на туташняй зямлі Беларускай», ў ліку 10000 экзэмпляраў, дзе раіць сялянам як абараняць свае правы [3, с. 157].

Згодна з гэтай пракламацыяй дзейнічалі парабкі фальварка Лошыца недалёка ад Мінска, якія зрабілі забастоўку і прапанавалі памешчыку ўстанавіць 14-гадзінны працоўны дзень, змяніць эканома, павялічыць ардынарыю і інш. [5, с. 264]. Безумоўна, гэтыя патрабаванні мелі вельмі абмежаваны характар, але тым не менш яны ўносілі элемент арганізацыі ў выступленні сельскагаспадарчых рабочых. Дзякуючы працы беларускіх рэвалюцыянераў, сацыялістычныя ідэі з лозунгамі вызвалення ад самадзяржаўя і эканамічнага ўціску ўпершыню трапляюць у шматлікія глухія закуткі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў.

У студзені 1906 г. у Мінску быў скліканы II з’езд БСГ, на парадак дня якога былі пастаўлены наступныя пытанні: перагляд партыйнай праграмы, распрацоўка аграрнай праграмы і тактыкі партыі, арганізацыйныя пытанні і выбранне ЦК [2, с. 27].

Самая гарачая дыскусія на з’ездзе ўзнікла ў адносінах да трэцяй часткі праграмы, якая была прысвечана вырашэнню аграрнага пытання. Спрэчка ўзнікла паміж братамі Луцкевічамі, бо кожны з іх меў свой погляд на вырашэнне гэтага пытання. Як указвае Антон Луцкевіч [2, с. 24], яго брат лічыў неабходным даць сялянству, як больш зразумелы яму, лозунг «дзялі зямлю», які быў разлічаны на працяг і ўзмацненне рэвалюцыі, ён глядзеў на яе развіццё больш аптымістычна, чым іншыя дэлегаты з’езда. Антон Луцкевіч, які разам з А. Уласавым падрыхтаваў да з’езда праект аграрнай праграмы, наадварот, схіляўся да погляду, што рэвалюцыйны выбух ужо заканчваецца і пачынаецца рэакцыя, супраць якой партыя бяссільна, і таму яго праект праграмы па зямельнаму пытанню як бы прадугледжваў наперад доўгі шлях да ажыццяўлення. У аснову яго праграмы павінна было легчы абагульненне ўсіх памешчыцкіх, царкоўных, казённых і ўдзельных зямель, якія складалі нацыянальны зямельны фонд Беларусі, з тым, каб з гэтых зямель утварыліся рацыянальна арганізаваныя хутары, якія б былі здольны пры дастатковай колькасці зямлі не толькі пракарміць сялянскую сям’ю, але і пастаўляць хлеб і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты на рынак у горад. Пры дапамозе краёвай улады такія хутары павінны былі б арганізоўваць шляхам кааперацыі вытворчыя прадпрыемствы, і тыя, якія пераапрацоўваюць сыравіну на месцы тымі сялянамі, для якіх не хапіла б хутароў. Такім чынам, стварыўся б у вёсцы замест буйнай і сярэдняй зямельнай буржуазіі – па нацыянальнасці польскай і рускай – новы клас дробных вытворцаў-хутаран, па нацыянальнасці беларускі. Як зазначае сам А. Луцкевіч: «Я лічыў, што хутаране-кулакі стануць на чале нараджаючагася беларускага народа і што дзякуючы матэрыяльнаму забеспячэнню, з гэтага асяроддзя будзе вырастаць беларуская нацыянальная інтэлігенцыя, атрымліваючы адукацыю ў сярэдніх і вышэйшых школах. Такім чынам, мой практ зямельнай праграмы, вырашаючы зямельную праблему толькі ў адносінах да той часткі сялян, якой дастануцца добраўпарадкаваныя хутары, пакідаў незадаволенай астатнюю масу сялянства, пераводзячы яе ў становішча зямельнага пралетарыяту» [4, с. 131].

На гэтым партыйным з’ездзе аграрная праграма Антона Луцкевіча атрымала падтрымку і была прынята як праграма БСГ. Яна складалася з наступных пунктаў:

«1) Утварэнне абласных зямельных фондаў з касцёльных, царкоўных, удзельных, кабінецкіх, манастырскіх і прыватнаўласніцкіх зямель.

2) Малазямельным і беззямельным працуючым на зямлі неабходна раней за ўсіх адкрыць доступ да зямлі для пажыццёвага карыстання; перавага на карыстанне ўчасткамі грамадскай зямлі, якую пакінуў земляроб па прычыне непрацаздольнасці, смерці і г.д., аддаецца яго бліжэйшым супрацоўнікам. Доступ да зямлі, па магчымасці, павінен быць забяспечан матэрыяльнай падтрымкай тых, хто адчувае патрэбу ў ёй для завядзення гаспадаркі.



Репозиторий ВГУ

3) Зямельная рэнта павінна быць уласнасцю края і перайсці ў карысць самапрацуючых абласных арганізацый.

4) Абласныя дзяржаўныя арганізацыі вызначаюць форму і парадак канфіскацыі зямель.

5) Дробныя самакіраваныя арганізацыі вызначаць колькасць зямлі, неабходнае для забяспячэння працоўных на зямлі. БСГ патрабуе перахода ў грамадскую ўласнасць лясоў, паш і вадзяной сілы» [6, с. 161].

**Заключэнне.** Такім чынам, у пачатковы перыяд рэвалюцыі БСГ схілялася да рэвалюцыйнага вырашэння аграрнага пытання, нават добра разумела магчымасць грамадзянскай вайны за зямлю. Але па меры адступлення рэвалюцыі і абмеркавання праектаў вырашэння зямельнага пытання на Беларусі, была прынята аграрная праграма на II-га з'ездзе БСГ, якая арыентавалася не на рэвалюцыю, а на рэфарміцкі, па сутнасці ліберальны шлях развіцця. Гэты ж момант вызначыў і далейшую эвалюцыю грамадоўцаў да «нашаніўства», перыяду, калі БСГ зрабіла вялікую эвалюцыю ўправа, паступова адмаўляючыся ад сваіх радыкальных і нават рэвалюцыйных заклікаў 1905 г.

*Спіс літаратуры*


1. Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. – Ф. 62. – Воп.1. – Спр. 204. – Арк. 4–6.
2. Луцкевіч, А. За дваццаць пяць гадоў (1903–1928 гг.): Успаміны аб працы першых беларускіх арганізацыяў: Беларуская рэвалюцыйная грамада. Беларуская сацыялістычная грамада / А. Луцкевіч. – Вільня, 1928. – С.52.
3. Мялешка, М. Барацьба Беларускай Сацыялістычнай Грамады за зямлю ў 1905 г. / М. Мялешка // Полымя. – 1926. – № 1. – С.152–159.
4. Собственноручные показания А.И. Луцкевича 30 октября 1939 г. // Неман. – 1995. – № 1. – С.128–158.
5. Шабуня, К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии / К.И. Шабуня. – Минск, 1962. – С. 435.
6. Шлюбскі, А.А. Да гісторыі БСГ / А.А. Шлюбскі // Полымя. – 1925. – № 5. – С.158–161.


## РЕКРЕАЦИОННО-ГЕОГРАФИЧЕСКОЕ ПОЛОЖЕНИЕ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ КАК ФАКТОР РАЗВИТИЯ ТУРИЗМА В РЕГИОНЕ


*Л.Ф. Трацевская*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


Развитие и конкурентоспособность туристской деятельности как региона в целом, так и осуществляющих ее организаций, во многом определяются влиянием факторов макросреды, важнейшим из которых является рекреационно-географическое положение. Особенно велико значение данного фактора в современном развитии и функционировании предприятий туризма Витебской области как ключевого туристского региона Беларуси, что предопределило актуальность проведенного исследования.

Целью данной публикации является анализ рекреационно-географического положения Витебской области и его влияния на развитие туризма в данном регионе Республики Беларусь.

**Материал и методы.** Для реализации цели исследования использовались труды отечественных ученых-экономистов, материалы о социально-экономическом развитии Витебской области. В процессе исследования применялись такие методы познания, как логико-дедуктивный метод, восхождение от абстрактного к конкретному, анализ и синтез.

**Результаты и их обсуждение.** Рекреационно-географическое положение Витебской области характеризуется следующими основными чертами.

*Территориальное расположение региона.* Витебская область, занимая 40 тыс. кв. км, находится в северной части Республики Беларусь в среднем течении Западной Двины и верховьях Днепра. Территория Витебщины относится к уникальному природно-географическому комплексу Белорусского Поозерья, благодаря чему регион отличают живописные ландшафты, где сочетаются холмистые ледниковые возвышенности и про-

Репозиторий ВГУ